Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Акадэмія адукацыі»

Аб’ект аўтарскага права
УДК 373.016:94(476)(091)(043.3)+94(072)(043.3)

**ПАНОЎ**
**Сяргей Веніямінавіч**

# РАЗВІЦЦЁ ШКОЛЬНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка,
гісторыя педагогікі і адукацыі

Мінск, 2025

Работа выканана ў навукова-метадычнай установе
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

**Навуковы кансультант:** **Марзалюк Ігар Аляксандравіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**Афіцыйныя апаненты:** **Снапкова Алена Іванаўна,** доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»

**Болбас Валерый Сяргеевіч**, доктар педагагічных навук, прафесар, прафесар кафедры педагогікі ўстановы адукацыі «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна»

**Белазаровіч Віктар Аляксандравіч,** доктар гістарычных навук, дацэнт, дэкан факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

**Апаніруючая арганізацыя:** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

Абарона адбудзецца «28» лютага 2025 г. у 13.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.23.01 пры дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія адукацыі»: 220004, г. Мінск, вул. Караля, 16, аўд. 301, e-mail: info@akademy.by; тэлефон вучонага сакратара: 276-48-17.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі».

Аўтарэферат разасланы «28» студзеня 2025 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт М. Б. Гарбунова

## УВОДЗІНЫ

Актуальнасць гісторыка-педагагічнага даследавання абумоўлена мэтазгоднасцю сістэматызацыі і абагульнення больш чым 30-гадовага вопыту станаўлення і развіцця ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі. Яна пазіцыяніруецца як трохступеньчатая (на I, II, III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі) *комплексная педагагічная сістэма* ў складзе канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыянальна-функцыянальнага, зместава-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў. Вывучэнне працэсу пераемных якасных змен у школьнай гістарычнай адукацыі ўвасобілася ў вызначэнні і абгрунтаванні канцэптуальных асноў яе развіцця як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і сацыягуманітарнай з'явы ў Рэспубліцы Беларусь, пачынаючы з 1991 г.

*Канцэптуальныя асновы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў якасці інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы* ўключаюць у сябе: мэты і задачы; місію; прынцыпы абнаўлення зместу адукацыі і яго структуравання; функцыянал; агульнапедагагічныя канцэпцыі зместу адукацыі і падыходы, рэалізаваныя ў адукацыйным працэсе; прадметна-гістарычныя падыходы да канструявання зместу і прынцыпы яго адбору.

*Канцэптуальныя асновы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў якасці сацыягуманітарнай з'явы* складаюць: канцэпцыі акадэмічнай гістарычнай навукі і яе падыходы да разумення грамадска-гістарычнага працэсу; міждысцыплінарныя канцэпты (лац. conceptus – разуменне, адзіная задума, вядучая думка) гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства. Пры зместавым напаўненні згаданых канцэптаў актуальна, якім чынам школьная гістарычная адукацыя выконвае ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі функцыю механізма пераемнасці ў грамадскай свядомасці падзей, з'яў, працэсаў, дзейнасці выдатных асоб для захавання і трансляцыі калектыўнай гістарычнай памяці (напрыклад, стварэння пантэона нацыянальных герояў).

Сучасным фактарам развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца *дзяржаўная гістарычная палітыка*, накіраваная на замацаванне ў Беларусі беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці. У адпаведнасці з дзяржаўнай гістарычнай палітыкай рэалізуецца нацыястваральны патэнцыял гісторыі Беларусі.

Даследаванне актуалізавана ў сувязі са спробамі неаб'ектыўнага перагляду гісторыі. Гэтыя спробы закранаюць традыцыйныя маральныя каштоўнасці і арыенціры беларускага грамадства, што адзначана ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2010 г.). Пры ажыццяўленні Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гады з'яўляецца запатрабаванай светапоглядна-выхаваўчая роля школьнай гістарычнай адукацыі. Яна арыентавана на фарміраванне грамадзянскага патрыятызму ў працэсе замацавання каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту. Грамадзянскі аспект патрыятызму непасрэдна звязаны з рэалізацыяй канцэпту беларускай дзяржаўнасці.

Дысертацыйнае даследаванне абапіраецца на працы айчынных даследчыкаў: кароткі агляд працэсу стварэння нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь зроблены І. І. Багдановічам; фарміраванне новай канцэпцыі гісторыі Беларусі ў сістэме сярэдняй агульнаадукацыйнай школы ў 1986–1990-я гг., прадстаўленае В. П. Вірскай; вызначэнне А. А. Корзюкам і Д. А. Касяковай навукова-гістарычных, метадалагічных і дыдактычных падыходаў да падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Рэспубліцы Беларусь і адпаведнай перыядызацыі развіцця школьнай гістарычнай адукацыі. Акадэмічная гістарычная навука, у прыватнасці распрацаваны ёю канцэпт беларускай дзяржаўнасці, прадстаўлена працамі і поглядамі акадэмікаў НАН Беларусі М. П. Касцюка, А. А. Кавалені, членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі П. Ц. Петрыкава, І. А. Марзалюка, айчынных гісторыкаў М. С. Сташкевіча, В. В. Даніловіча, М. У. Смяховіча. У даследаванні ўлічаны напрацоўкі айчынных вучоных-гісторыкаў, метадалагічныя падыходы акадэмічнай гістарычнай навукі, рэалізаваныя ў практыцы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па сусветнай гісторыі У. С. Кошалевым; тэарэтычныя і практыка-арыентаваныя праблемы сучаснага навучання гісторыі, прааналізаваныя С. М. Цемушавым. У даследаванні выкарыстаны працы расійскіх вучоных Я. Я. Вяземскага, В. Ю. Стрэлавай, Л. М. Аляксашкінай, прысвечаныя гісторыі, тэорыі і практыцы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Расійскай Федэрацыі ў 90-я гг. ХХ ст. – пачатку ХХІ ст., улічаны заканамернасці станаўлення зместу сацыяльна-гуманітарнай адукацыі ў Расійскай Федэрацыі, якія выяўлены Л. Н. Багалюбавым.

Вывучэнне тэорыі і практыкі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь дазваляе сфармуляваць *супярэчнасці*, якія абумоўліваюць праблематыку дысертацыйнага даследавання:



– паміж культуралагічнай канцэпцыяй зместу адукацыі як педагагічна адаптаванага сацыяльнага вопыту чалавецтва і яго прадстаўленнем у школьнай вучэбнай літаратуры пераважна без уліку фарміравання ў вучняў вопыту эмацыянальна-каштоўнасных адносін да гістарычных падзей і іх удзельнікаў;

– функцыяналам школьнай гістарычнай адукацыі і мэтазгоднасцю яго ўдакладнення ва ўмовах рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь;

– традыцыйным ведацэнтрычным мэтавызначэннем і яго сучаснай накіраванасцю на развіццё інтэграваных якасцей асобы, сярод якіх – гістарычная памяць і нацыянальна-культурная ідэнтычнасць;

– прынцыпам навуковасці пры канструяванні зместу школьнай гістарычнай адукацыі і рэалізацыяй прынцыпу яго даступнасці;

– празмернай факталагічнасцю зместу і ўдакладненнем прынцыпаў яго адбору з улікам канцэнтрычнай структуры адукацыі і спецыфікі навукова-гістарычнага факта.

*Крыніцы даследавання:* фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь; канцэпцыі, адукацыйныя стандарты, інструктыўна-метадычныя пісьмы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь; вынікі маніторынгаў навучання вучняў па гісторыі і вынікі вопытнай праверкі ў Нацыянальным інстытуце адукацыі вучэбных дапаможнікаў па гісторыі; вынікі рэспубліканскіх кантрольных работ па гісторыі; вучэбная і вучэбна-метадычная літаратура па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі; матэрыялы сацыялагічных даследаванняў Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Храналагічныя межы даследавання* вызначаюцца з 1991 г., калі была распрацавана Канцэпцыя гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі. У 2022 г. завяршыўся пераход на канцэнтрычную структуру і змест гістарычнай адукацыі на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі, была адобрана Канцэпцыя школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, рэалізацыя якой ажыццяўляецца ў сучасны перыяд.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне выканана ў межах навукова-даследчых тэм, якія рэалізоўваліся ў навукова-метадычнай установе «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: «Упарадкаваць тэрміналагічны апарат па падручніках сацыяльна-гуманітарнага цыкла для школы» (2004, № ДР 20042778); «Распрацаваць навукова-метадычнае забеспячэнне сацыякультурнай адукацыі ў кантэксце фарміравання ў вучняў палітычнай, праванай, сацыяльна-экалагічнай, эканамічнай, тэалагічнай, фізічнай і тэхналагічнай культуры як сродку рэалізацыі асобасна-арыентаванага і культуралагічнага падыходаў» (2006, № ДР 20063261); «Распрацаваць змест, метады і сродкі сацыкультурнай адукацыі з улікам сучаснага адукацыйнага асяроддзя» (2009–2011, № ДР 20091294); «Распрацаваць даведачна-інфармацыйныя, кантрольна-дыягнастычныя і інтэрактыўныя модулі электронных вучэбна-метадычных комплексаў для гуманітарнай і сацыякультурнай адукацыі» (2012–2014, № ДР 20122244); «Распрацаваць змест і кампаненты дыдактычнага забеспячэння па сацыякультурнай адукацыі на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ў кантэксце кампетэнтнаснага падыходу» (2015–2017, № ДР 20150850); «Распрацаваць змест і навукова-метадычнае забеспячэнне для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з улікам пераемнасці і перспектыўнасці навучання ў кантэксце кампетэнтнаснага падыходу» (2015–2017, № ДР 20150851); «Распрацаваць навукова-метадычнае забеспячэнне фарміравання ў вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі асобасных і метапрадметных кампетэнцый у вучэбнай і пазаўрочнай дзейнасці» (2018–2020, № ДР 20181223); «Распрацаваць навукова-метадычнае забеспячэнне фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі» (2021–2025, № ДР 20212109). Даследаванне звязана з выкананнем навукова-даследчай работы ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»: «Распрацаваць змест і навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай, вышэйшай педагагічнай і дадатковай адукацыі педагагічных работнікаў у мэтах павышэння якасці адукацыі ў сучасных сацыяльна-эканамічных умовах» (2015–2017, № ДР 20151237). Дысертацыйнае даследаванне выканана ў адпаведнасці з наступнымі навукова-даследчымі работамі ў дзяржаўнай установе адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»: «Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да вывучэння і выкладання айчыннай і сусветнай гісторыі» (2010, № ДР 20101102); «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: навуковае вымярэнне і адукацыйны патэнцыял» (2019, № ДР 20190350); «Навукова абгрунтаваць і распрацаваць мадэль патрыятычнага выхавання моладзі Рэспублікі Беларусь да 2025 г.» (2021, № ДР 20211298). Даследаванне звязана з выкананнем навукова-даследчай работы ва ўстанове адукацыі «Віцебскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»: «Князь Альгерд і амір Цімур: актуалізацыя Сярэдневякоўя ў гістарычнай памяці Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Узбекістан на нацыянальна-дзяржаўным і рэгіянальным узроўнях» (2022–2024, № ДР 20221014).

**Мэта і задачы, аб'ект і прадмет даследавання**

**Мэта** – вызначэнне і абгрунтаванне канцэптуальных асноў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

**Задачы даследавання:**

1) вызначыць метадалагічную спецыфіку гісторыка-педагагічнага даследавання школьнай гістарычнай адукацыі з яе ўдакладненнем як комплекснай шматкампанентнай і шматфактарнай педагагічнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь;

2) сістэматызаваць метадалагічныя падыходы, якія рэалізуюцца ў школьнай гістарычнай адукацыі Рэспублікі Беларусь;

3) сканструяваць структурна-зместавую мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

4) распрацаваць перыядызацыю этапаў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

5) выявіць тэндэнцыі ў канцэптуальных мэтавызначэнні, прынцыпах абнаўлення і структуравання зместу школьнай гістарычнай адукацыі, яе функцыянале;

6) ахарактарызаваць прадстаўленыя ў навукова-педагагічным супольніцтве міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства і іх актуальнасць у школьнай гістарычнай адукацыі;

7) канкрэтызаваць перспектывы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі з улікам нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі, выхавання патрыятызму і грамадзянскасці ў вучняў, фарміравання іх нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, удакладнення прынцыпаў адбору зместу.

**Аб'ект даследавання** – школьная гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь.

**Прадмет даследавання** – працэс развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь з 1991 г.

Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены вывучэннем змен канцэптуальных асноў і вызначэннем тэндэнцый развіцця школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай чатырохкампанентнай педагагічнай сістэмы, дэтэрмінацыя якой мае шматфактарны характар.

**Навуковая навізна.** У дысертацыйным даследаванні ўпершыню ў тэорыі і практыцы школьнай гістарычнай адукацыі комплексна вызначаны і абгрунтаваны яе канцэптуальныя асновы як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і сацыягуманітарнай з'явы.

Даследаванне працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы дазволіла ўдакладніць яе канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, зместава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны структурныя кампаненты, якія ахарактарызаваны ў сукупнасці з адпаведнымі ім фактарамі. Сярод іх афармленне ў Рэспубліцы Беларусь дзяржаўнай гістарычнай палітыкі і трансляцыя зместу адукацыі як сацыяльнага вопыту ў адпаведнасці з культуралагічнай мадэллю яе зместу ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі.

Сканструявана структурна-зместавая мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, якая з'яўляецца ўніверсальным інструментам гісторыка-педагагічнага даследавання.

Распрацавана перыядызацыя этапаў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі. Яна комплексна ўлічвае працэс вызначэння яе канцэптуальных асноў у 1991, 2009, 2022 гг.; стандартызацыю ў трох пакаленнях адукацыйных стандартаў 1998, 2009, 2018 гг.; структураванне зместу адукацыі па канцэнтрычным і лінейным прынцыпах; канструяванне зместу ў пяці пакаленнях школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры; рэалізацыю культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў.

Навуковыя вынікі гісторыка-педагагічнага даследавання развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь упершыню канцэптуалізаваны праз тэарэтычнае вызначэнне прадстаўнікамі навукова-педагагічнага супольніцтва і рэалізацыю ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі міждысцыплінарных канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства.

Выяўлены тэндэнцыі ў канцэптуальным мэтавызначэнні, функцыянале, прынцыпах абнаўлення і структуравання зместу і яго адборы. Яны ўвасобіліся ў арыентацыі на развіццё такіх інтэграваных характарыстык асобы, як гістарычная памяць і нацыянальна-культурная ідэнтычнасць; рэалізацыі шэрагу функцый, сярод якіх светапоглядная, дзейнасна-



паводзінская, фарміравання функцыянальнай адукаванасці, а таксама прынцыпаў антрапалагізацыі зместу, культурна-гістарычнага асяроддзя, гістарычнай дыялагічнасці.

Канкрэтызаваны перспектывы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, якія ўвасобіліся ў тэндэнцыях, звязаных з рэалізацыяй нацыястваральнага патэнцыялу вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі», актуалізацыяй грамадзянска-патрыятычнага выхавання праз улік адпаведнай сацыяльна-педагагічнай мадэлі, інтэграцыяй гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

**1.** Вызначаная спецыфіка гісторыка-педагагічнага даследавання школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай шматкампанентнай і шматфактарнай педагагічнай сістэмы мае міждысцыплінарны характар. Гэтая спецыфіка абумоўлена метадалагічнымі асаблівасцямі *гісторыі адукацыі* (педагагічнасць, гістарычнасць, культуралагічнасць, сацыялагічнасць, паліталагічнасць, антрапалагічнасць, філасафічнасць) у спалучэнні з метадалагічнымі прынцыпамі *гістарычнага пазнання* (навуковасць, гістарызм, аб'ектыўнасць, прычыннаабумоўленасць, сістэмнасць, альтэрнатыўнасць, лагічнае абгрунтаванне, гуманізм у ацэначных меркаваннях, шматфактарнасць).

Школьная гістарычная адукацыя як комплексная педагагічная сістэма ў сваёй структурнай цэласнасці складаецца з канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыянальна-функцыянальнага, зместава-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў, якія дэтэрмінаваны адпаведнымі ім фактарамі.

*Канцэптуальна-метадалагічны кампанент* улічвае фактар нарматыўна-прававвой распрацоўкі канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі, змяшчае акадэмічна-гістарычныя і агульнапедагагічныя падыходы, міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства, прадугледжвае вызначэнне спецыфікі гісторыка-педагагічнага даследавання.

*Інстытуцыянальна-функцыянальны кампанент* абумоўлены дзяржаўнай гістарычнай палітыкай як фактарам станаўлення і развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, змяшчае яе мэтавызначэнне і функцыянал, прынцыпы абнаўлення зместу і яго структуравання, прадугледжвае вызначэнне этапаў і тэндэнцый развіцця адукацыі.

*Зместава-дзейнасны кампанент* прадвызначаны рэалізацыяй гісторыяй Беларусі нацыястваральнай ролі як фактару станаўлення і развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, прадметна-гістарычнымі

падыходамі, спецыфікай навукова-гістарычнага факта, структурай зместу школьнай гістарычнай адукацыі, зместавымі лініямі, зместавым напаўненнем згаданых у канцэптуальна-метадалагічным кампаненце міждысцыплінарных канцэптаў, прадугледжвае ўдакладненне прынцыпаў адбору зместу адукацыі.

*Сацыяльна-аксіялагічны кампанент* дэтэрмінаваны зменай механізмаў трансляцыі сацыяльнага вопыту як зместу адукацыі ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі пры захаванні гістарычнай памяці і пераемнасці традыцыйнай сістэмы каштоўнасцей, улічвае светапоглядна-выхаваўчую ролю школьнай гістарычнай адукацыі, асабістыя адносіны настаўнікаў і вучняў да гістарычных падзей і персаналій, прафесійныя адносіны настаўнікаў да канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў структуравання зместу.

**2.** Сістэматызаваныя метадалагічныя падыходы, якія рэалізуюцца ў школьнай гістарычнай адукацыі, заключаюцца ў наступным.

*Агульнапедагагічныя падыходы* (культуралагічны і кампетэнтнасны) з'яўляюцца пераемнымі ў працэсе фарміравання ў вучняў вопыту творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін, які адпавядае кампетэнцыям крэатыўнага мыслення і эмацыянальнай рэгуляцыі.

*Падыходы акадэмічнай гістарычнай навукі* (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны) да разумення грамадска-гістарычнага працэсу рэалізаваны з улікам спецыфікі навуковага гістарычнага факта і эвалюцыянавалі ад этнакультурнай да нацыянальна-дзяржаўнай дамінанты ў прадметным змесце гісторыі Беларусі.

*Прадметна-гістарычныя падыходы* да канструявання зместу адукацыі ажыццяўляюцца з улікам структурных кампанентаў зместу школьнай гістарычнай адукацыі (ведавы, дзейнасны, эмацыянальна-каштоўнасны) і канкрэтызуюцца наступным чынам:

*гісторыка-крыніцазнаўчы падыход* – абумоўлівае комплекснае выкарыстанне ў школьнай гістарычнай адукацыі разнажанравых гістарычных першакрыніц з улікам спецыфікі навуковага гістарычнага факта і ў сваім патэнцыяле ўлічвае магчымасць іх тэарэтычнага абагульнення і дыялагічнай інтэрпрэтацыі, разгляд альтэрнатыўных сітуацый пры тэарэтычным асэнсаванні варыянтаў грамадскага развіцця ў гістарычным мінулым;

*гісторыка-антрапалагічны падыход* – прадвызначае паказ культурна-гістарычных узораў (аналагаў) сацыяльных паводзін чалавека ў гісторыі і ў сваім патэнцыяле спалучае фармальна-факталагічнае біяграфічнае апісанне ролі гістарычных асоб з улікам магчымасцей складання іх біяграм;



*гісторыка-аксіялагічны падыход* – улічвае сістэму агульнапрынятых у сучасным беларускім грамадстве традыцыйных каштоўнасцей як адзін з праксеалагічных крытэрыяў адбору зместу.

**3.** Сканструяваная структурна-зместавая мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі складаецца з кампанентаў, якія адпавядаюць яе структуры.

*Канцэптуальна-метадалагічны кампанент* прадугледжвае: вывучэнне канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі, прадстаўленых як нарматыўна-прававыя ў трох пакаленнях канцэпцый; азнаямленне з практыкай рэалізацыі агульнапедагагічных і акадэмічна-гістарычных падыходаў; вызначэнне міждысцыплінарных канцэптаў акадэмічнай гісторыі, паліталогіі, сацыялогіі; характарыстыку спецыфікі гісторыка-педагагічнага даследавання.

*Інстытуцыянальна-функцыянальны кампанент* прадугледжвае вывучэнне працэсу афармлення дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, змен у мэтавызначэнні школьнай гістарычнай адукацыі, прынцыпах абнаўлення яе зместу і структуравання, функцыянале, выяўленне этапаў і тэндэнцый развіцця.

*Зместава-дзейнасны кампанент* прадвызначае нацыястваральны патэнцыял гісторыі Беларусі, прадугледжвае вывучэнне рэалізацыі прадметна-гістарычных падыходаў з улікам спецыфікі навукова-гістарычнага факта і шматкампанентнай структуры зместу школьнай гістарычнай адукацыі, удакладнення зместавых ліній школьнай гістарычнай адукацыі і прынцыпаў адбору яе зместу.

*Сацыяльна-аксіялагічны кампанент* улічвае змену механізма трансляцыі зместу адукацыі як сацыяльнага вопыту ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі пры актуалізацыі сістэмы традыцыйных каштоўнасных арыентацый беларускага грамадства, фарміравання патрыятызму і грамадзянскасці ў працэсе рэалізацыі выхаваўчай функцыі школьнай гістарычнай адукацыі; прадугледжвае вывучэнне асабістых адносін настаўнікаў і вучняў да адлюстраваных у вучэбнай літаратуры падзей у гісторыі Беларусі і іх удзельнікаў, а таксама прафесійных адносін настаўнікаў да канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў структуравання зместу.

**4.** Распрацаваная перыядызацыя этапаў развіцця ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі грунтуецца на комплексным характары, што ўлічвае вызначэнне канцэптуальных асноў у канцэпцыях (1991, 2009, 2022 гг.); распрацоўку адукацыйных стандартаў (1998, 2009, 2018 гг.); структураванне зместу адукацыі па канцэнтрычным

і лінейным прынцыпах; падрыхтоўку пяці пакаленняў вучэбнай літаратуры па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі; рэалізацыю культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў; афармленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.

Этапы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь характарызуюцца наступным чынам:

– *канцэптуальна-вызначальны* (1991–1997 гг.): распрацоўка Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі (1991 г.), у якой абвяшчаліся прынцыпы абнаўлення канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі; наданне гісторыі Беларусі статусу самастойнага вучэбнага прадмета (1992 г.); падрыхтоўка першага пакалення школьнай вучэбнай літаратуры (з 1993 г.);

– *метадычна-стваральны* (1998–2008 гг.): падрыхтоўка на нацыянальна-дзяржаўнай аснове другога і трэцяга (з 2003 г.) пакаленняў школьнай вучэбнай літаратуры з распрацаваным метадычным апаратам ва ўмовах пераходу з 1998 г. агульнаадукацыйнай школы на 12-гадовы тэрмін навучання і рэалізацыі канцэнтрычнага падыходу да структуравання зместу школьнай гістарычнай адукацыі; увядзенне ў дзеянне адукацыйнага стандарту агульнай сярэдняй адукацыі па блоку сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (1998 г.);

– *канцэптуальна-прадметны* (2009–2014 гг.): зацвярджэнне Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» і яго адукацыйнага стандарту (2009 г.) з вызначэннем прынцыпаў абнаўлення зместу школьнай гістарычнай адукацыі, якія сталі зыходнымі пры зместавым напаўненні чацвёртага пакалення школьнай вучэбнай літаратуры ва ўмовах вяртання агульнаадукацыйнай школы на 11-гадовы тэрмін навучання, што завяршыўся ў 2014 г., і рэалізацыі пераходу ад канцэнтрычнага да лінейнага прынцыпу структуравання зместу школьнай гістарычнай адукацыі;

– *кампетэнтнасна-арыентаваны* (2015–2022 гг.): падрыхтоўка пятага пакалення школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі ва ўмовах рэалізацыі з 2015/2016 навучальнага года кампетэнтнаснага падыходу і завяршэння ў 2021/2022 навучальным годзе пераходу ад лінейнага да канцэнтрычнага прынцыпу структуравання зместу; увядзенне ў дзеянне адукацыйнага стандарту агульнай сярэдняй адукацыі (2018 г.); адабрэнне пастановай калегіі Міністэрства адукацыі Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (2022 г.).

З 2023 г. пачынаецца сучасны этап развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, які характарызуецца рэалізацыяй



дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ва ўмовах ажыццяўлення Канцэпцыі 2022 г., а таксама інтэграцыяй гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**5.** Выяўленыя тэндэнцыі як кірункі развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў яе канцэптуальных мэтавызначэнні, прынцыпах абнаўлення і структуравання зместу, функцыянале ўвасобіліся ў наступным.

*Канцэптуальнае мэтавызначэнне* змянілася ад кансерватыўнага захавання вузкапрадметна-ведавай прыярытэтнасці да арыентаванасці на развіццё вучня пры актуалізацыі асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў вучэбнай дзейнасці з улікам такіх характарыстык асобы, як гістарычная памяць і нацыянальна-культурная ідэнтычнасць.

*Прынцыпы абнаўлення зместу* школьнай гістарычнай адукацыі, комплексна прадстаўленыя ў трох пакаленнях канцэпцый (гістарызму, метадалагічнага плюралізму, навуковасці, аб'ектыўнасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці, пераемнасці паміж канцэнтрамі, сувязі навучання з жыццём, рэалізацыі ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей, вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай), сведчаць аб іх сэнсава-зместавай пераемнасці пры актуалізацыі прынцыпаў адзінства выхавання і навучання, дыскрэтнасці зместу, даступнасці, вобразнасці і антрапалагізацыі, культурна-гістарычнага асяроддзя, гістарычнай дыялагічнасці.

*Структураванне зместу* школьнай гістарычнай адукацыі сведчыць пра пэўную цыклічнасць пры рэалізацыі канцэнтрычнага (1992–2008 гг., з 2015 г.) і лінейнага (2009–2014 гг.) прынцыпаў.

*Функцыі школьнай гістарычнай адукацыі* комплексна і сістэмна ўдакладняюцца. Яны прадстаўлены гісторыка-пазнавальнай, навучальнай, развіццёвай, выхаваўчай, сацыялізуючай функцыямі пры актуалізацыі светапогляднай, кансерватыўна-пераемнай, кампенсаторнай, адаптацыйнай, контрнаступальнай, дзейнасна-паводзінскай, прафарыентацыйна-прагнастычнай, функцыі фарміравання функцыянальнай адукаванасці.

**6.** Ахарактарызаваныя ў навукова-педагагічным супольніцтве міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства актуалізуюцца ў школьнай гістарычнай адукацыі наступным чынам.

*Канцэпт гістарычнай памяці* адлюстраваны ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі сукупнасцю гістарычных асоб і падзей (працэсаў) ва ўмовах фарміравання ўласна беларускай мадэлі гістарычнай памяці

і стварэння ў Рэспубліцы Беларусь пантэона нацыянальных герояў. Канцэпт гістарычнай памяці ўлічвае рэалізацыю яе кансалідаванай функцыі пры канструяванні зместу школьнай гістарычнай адукацыі, актуалізуецца захаваннем гістарычнай памяці пра Перамогу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў адпаведнасці з дзяржаўнай гістарычнай палітыкай. Названы канцэпт патэнцыяльна трансфарміруецца з інстытуцыянальнай сацыяльна-педагагічнай катэгорыі ў інтэгратыўную якасць асобы вучня.

*Канцэпты нацыі і нацыянальнай ідэі* ўвасоблены ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі праз адлюстраванне іх рэтраспектывы і сучаснай эвалюцыі, актуалізаваны ва ўмовах афармлення агульнанацыянальнай ідэі ў якасці асновы светапогляду сучасных вучняў.

*Канцэпт беларускай дзяржаўнасці* праяўляецца праз яе гістарычныя і нацыянальныя формы ў прадметным змесце гісторыі Беларусі, актуалізуецца ва ўмовах фарміравання каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь у вучняў як прадстаўнікоў сучаснай беларускай грамадзянскай нацыі і грамадзян Рэспублікі Беларусь.

*Канцэпт традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства* адлюстраваны праз характарыстыку і прыклады паводзін прадстаўнікоў беларускай нацыі ў гісторыі пазіцыяніруецца ў якасці прынцыпу адбору сацыяльна-аксіялагічнага зместу школьнай гістарычнай адукацыі.

**7.** Канкрэтызаваныя перспектывы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ўвасабляюцца ў наступных тэндэнцыях.

*Рэалізацыя нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі* ажыццяўляецца згодна з патрабаваннем дзяржаўнай гістарычнай палітыкі аб фарміраванні ўласна беларускага вобраза гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці з улікам канцэптаў гістарычнай памяці, беларускай дзяржаўнасці ў яе нацыянальных формах, грамадзянскай нацыі, агульнанацыянальнай ідэі.

*Актуалізацыя светапоглядна-выхаваўчай ролі школьнай гістарычнай адукацыі* адбываецца з улікам распрацаванай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі, якая ў сваёй структуры змяшчае духоўна-маральны, нацыянальна-дзяржаўны, адукацыйна-прафесійны, аздараўленча-спартыўны кампаненты і мае этнанацыянальны, культурна-гістарычны, сацыякультурны, аксіялагічны кантэксты сваёй рэалізацыі.

*Фарміраванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці* вучняў як эмацыянальна-псіхалагічнай, палітыка-ідэалагічнай, культураадпаведнай пазіцыі асобы прадугледжвае комплекснае прадстаўленне культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі, прыкладаў сацыяльных паводзін



прадстаўнікоў беларускага этнасу (нацыі), якія ў гістарычнай рэтраспектыве сведчаць аб іх нацыянальнай самасвядомасці і адпавядаюць намінатыўнай маркерызацыі «Нацыянальны герой» разам з існуючай намінацыяй «Нашы славутыя землякі».

*Удакладненне комплексу прынцыпаў адбору зместу школьнай гістарычнай адукацыі* ажыццяўляецца ў кантэксце рэалізацыі акадэмічна-гістарычных і прадметна-гістарычных падыходаў; актуалізацыі дзейнаснага, эмацыянальна-каштоўнаснага кампанентаў зместу школьнай гістарычнай адукацыі, у тым ліку прадстаўлення метадалагічных ведаў на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі; далейшай распрацоўкі зместавых ліній з улікам іх міжпрадметнасці; уліку каштоўнасных арыентацый вучняў; пераадолення празмернай факталагічнасці; інтэграцыі зместу гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі; фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыя з'яўляецца вынікам самастойнага вывучэння саіскальнікам працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Саіскальнікам удакладнена структура школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы ў складзе канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыянальна-функцыянальнага, зместава-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў у сукупнасці з сутнаснай характарыстыкай адпаведных ім фактараў, сярод якіх – дзяржаўная гістарычная палітыка ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі. Саіскальнікам на аснове спалучэння метадалогіі гісторыка-педагагічнага даследавання і гістарычнага пазнання на канкрэтным прадметным змесце сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі ахарактарызавана рэалізацыя падыходаў акадэмічнай гістарычнай навукі да разумення грамадска-гістарычнага працэсу (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны); агульнапедагагічных (культуралагічнага ў пераемнасці з кампетэнтнасным) падыходаў; прадметна-гістарычных (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны) падыходаў да канструявання зместу школьнай гістарычнай адукацыі. Саіскальнікам распрацавана структурна-зместавая мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, вызначаны яе зместава-храналагічная перыядызацыя, тэндэнцыі ў канцэптуальных мэтавызначэнні, функцыях, прынцыпах абнаўлення і структуравання зместу; удакладнены прынцыпы адбору зместу. Саіскальнікам даследавана тэарэтычная характарыстыка ў навукова-педагагічным супольніцтве і адукацыйным асяроддзі канцэптаў

гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства, іх рэалізацыя ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі. З удзелам саіскальніка распрацавана сацыяльна-педагагічная мадэль патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі.

Саіскальнік з'яўляецца распрацоўшчыкам у складзе аўтарскіх калектываў Канцэпцыі «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» (2009 г.); Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (2022 г.); суаўтарам аднаго падручніка і 19 вучэбных дапаможнікаў па вучэбных прадметах «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», «Сусветная гісторыя», «Гісторыя Беларусі», інтэграванага курса «Гісторыя XIX – пачатак XXI ст.» з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Апрабацыя вынікаў даследавання ажыццяўлялася праз дзейнасць лабараторыі гісторыка-грамадазнаўчай і сацыякультурнай адукацыі навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама на кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» пры рэалізацыі праграм павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі педагагічных работнікаў (2010–2022 гг.).

Матэрыялы даследавання прадстаўлены на 34 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых, навукова-практычных, навукова-метадычных канферэнцыях, кангрэсе: «Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці» (Гродна, 3–4 мая 2002 г.); «Проблемы методологии исследований истории Беларуси» (Мінск, 26–27 кастрычніка 2006 г.); «Актуальные проблемы в изучении и преподавании общественно-гуманитарных наук (дисциплин)» (Віцебск, 1–2 снежня 2011 г.); «Методология и стратегия развития современного образования» (Мінск, 11 снежня 2014 г.); «Этот день мы приближали как могли…» (Мінск, 7–8 мая 2015 г.); «Высшая школа: проблемы и перспективы», (Мінск, 22–23 кастрычніка 2015 г.; 20 лютага 2018 г.; 29 лістапада 2019 г.); «Устойчивое развитие экономики: состояние, проблемы, перспективы» (Пінск, 22 мая 2015 г.); «“Долгий XIX век” в истории Беларуси и Восточной Европы» (Мінск, 19–20 кастрычніка 2017 г.); «Curriculumul şcolar: provocări şi oportunităţi de dezvoltare» (Кішынёў, 7–8 снежня 2018 г.); «Социальные, политические и культурные процессы на территории Центральной и Восточной Европы в исторической ретроспективе» (Пінск, 30 лістапада – 1 снежня 2018 г., 25–26 лютага 2022 г.); «Россия в зеркале военной истории XX века» (Казань, 11–20 красавіка 2019 г.); «Историческая память о Беларуси как фактор консолидации общества» (Мінск, 26–27 верасня 2019 г.); «Гістарычная навука Беларусі: асобы, канцэпцыі, дасягненні (да 90-годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі)» (Мінск, 17–18 кастрычніка 2019 г.); «Первый международный Петербургский исторический форум» (Санкт-Пецярбург, 29 кастрычніка – 3 лістапада 2019 г.); «Беларусь и Европа: историко-культурное наследие и современность» (Мінск, 24 красавіка 2020 г.; 1 красавіка 2021 г.); «Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: грамадства, дзяржава, асоба» (Гродна, 12–13 снежня 2019 г., 11–12 лістапада 2021 г.); «Государства Восточной и Центральной Европы в исторической перспективе» (Пінск, 27 лістапада 2020 г.); «Учебник как модель мира и общества» (Санкт-Пецярбург, 30–31 студзеня, 6–7 лютага 2021 г.); «Историческое образование в XXI веке: традиции, современные подходы» (Валгаград; 8–9 красавіка 2021 г.); «Проблеми сучасного підручника: ключові компетентності та предметні навички» (Кіеў, 20–21 мая 2021 г.); «Педагогічна компаративістика і міжнародна освіта – 2021: інновації в освіті в контексті європеїзації та глобалізації» (Кіеў, 27–28 мая 2021 г.); «Историческое и обществоведческое образование: ресурсы, проблемы и перспективы» (Улан-Удэ, 10–11 чэрвеня 2021 г.); «Охрана и популяризация культурного наследия: мировой и отечественный опыт» (Віцебск, 22–23 кастрычніка 2021 г.); «Личность. Образование. Общество. Национальная идентичность в условиях цифрового и социокультурного развития общества» (Гродна, 4–5 лістапада 2021 г.); «Institutul de Ştiinţe ale Educaţiei: ascensiune, performanţe, personalităţi» (Кішынёў, 10 снежня 2021 г.); «Русь – Белая Русь – Беларусь» (Мінск, 23–24 чэрвеня 2022 г.); «Второй Петербургский исторический форум» (Санкт-Пецярбург, 10–16 кастрычніка 2022 г.); «Историческая наука и образование в XXI веке» (Навасібірск, 22–25 сакавіка 2023 г.); «Инновационное образование как основополагающее условие повышения качества обучения на I ступени общего среднего образования» (Гомель, 22–23 чэрвеня 2023 г.). Матэрыялы даследавання выкарыстоўваліся на Міжнародным навукова-адукацыйным семінары «Школьная гістарычная адукацыя ў Саюзнай дзяржаве» (Смаленск, 20 снежня 2019 г.); пасяджэннях дыскусійнай пляцоўкі па актуальных праблемах гістарычнай адукацыі на базе Бурацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Д. Банзарава сумесна з рэдакцыяй часопіса «Преподавание истории в школе» (9 снежня 2021 г.; 10 лютага, 20 кастрычніка, 15 снежня 2022 г.); дыялогавых пляцоўках «Гістарычная справядлівасць як аснова патрыятычнага выхавання вучняў»

з настаўнікамі гісторыі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі г. Мінска (Мінск, 12 і 14 верасня 2023 г.).

Вынікі даследавання выкарыстоўваліся ў адукацыйным працэсе Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы; Магілёўскага, Брэсцкага, Мінскага, Гродзенскага, Гомельскага абласных, Мінскага гарадскога інстытутаў развіцця адукацыі; Акадэміі паслядыпломнай адукацыі; Нацыянальнага інстытута адукацыі, што пацвярджаецца 10 актамі аб практычным выкарыстанні.

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 83 публікацыях, з іх 32 – адпавядаюць патрабаванням пункта 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь: 1 манаграфія (11,77 аўт. арк.), 31 артыкул (з іх 2 – у суаўтарстве) у выданнях, уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (7,39 аўт. арк.), у тым ліку 4 артыкулы ў замежных навуковых выданнях. Публікацыі, якія пацвярджаюць практычную значнасць дысертацыйнага даследавання: 9 артыкулаў (з іх 2 – у суаўтарстве) у іншых навуковых выданнях (2,35 аўт. арк.); 6 артыкулаў у зборніках навуковых прац (1,35 аўт. арк.); 28 артыкулаў і тэзісаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (5,39 аўт. арк.); адзін навукова-метадычны дапаможнік (у суаўтарстве, 0,48 аўт. арк.), 3 вучэбныя дапаможнікі (у суаўтарстве) з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (11,02 аўт. арк.), 3 вучэбна-метадычныя дапаможнікі з грыфам Нацыянальнага інстытута адукацыі (20,32 аўт. арк.). Уклад суаўтараў сумесна апублікаваных прац не мае непасрэдных адносін да адлюстравання вынікаў дысертацыйнага даследавання, выкананага саіскальнікам асабіста. Агульны аб'ём публікацый па тэме дысертацыі складае 60,07 аўт. арк. Аб'ём аднаасобна апублікаваных саіскальнікам работ складае 38,70 аўт. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыі абумоўлена логікай гісторыка-педагагічнага даследавання і складаецца з наступных раздзелаў: уводзіны, агульная характарыстыка работы, чатыры главы, заключэнне, бібліяграфічны спіс (434 назвы, у тым ліку 351 выкарыстаная крыніца і 83 аўтарскія публікацыі), дадаткі (17 найменняў). У тэксце дысертацыі размяшчаюцца 7 малюнкаў і 12 табліц. Поўны аб'ём дысертацыі складае 262 старонкі, з якіх асноўны тэкст займае 189 старонак, спіс выкарыстаных крыніц – 36 старонак, дадаткі – 37 старонак.



# АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

У першай главе **«Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі»** прадстаўлена характарыстыка школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і як сацыягуманітарнай з'явы; удакладнены і ахарактарызаваны яе структурныя кампаненты; вызначана спецыфіка гісторыка-педагагічнага даследавання ў спалучэнні з метадалогіяй гістарычнага пазнання; выяўлена пераемнасць культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў пры іх рэалізацыі ў адукацыйнай практыцы навучання гісторыі; сістэматызаваны акадэмічна-гістарычныя падыходы да разумення грамадска-гістарычных працэсаў і прадметна-гістарычныя падыходы да канструявання зместу адукацыі.

Вызначана *міждысцыплінарная спецыфіка гісторыка-педагагічнага даследавання*, якая ўлічвае *метадалагічныя асаблівасці гісторыі адукацыі* (педагагічнасць, гістарычнасць, культуралагічнасць, сацыялагічнасць, паліталагічнасць, антрапалагічнасць, філасафічнасць), і *метадалагічныя прынцыпы гістарычнага пазнання* (навуковасць, гістарызм, аб'ектыўнасць, прычыннаабумоўленасць, сістэмнасць, альтэрнатыўнасць, лагічнае абгрунтаванне, гуманізм у ацэначных меркаваннях, шматфактарнасць) у іх спалучэнні. Сутнасць і спецыфіка, аб'ект і прадмет, метадалогія і функцыянал гісторыка-педагагічнага даследавання канкрэтызаваны з улікам навуковых прац расійскіх вучоных Б. М. Бім-Бада, Э. Д. Дняпрова, Р. Б. Карнетава і беларускіх даследчыкаў В. С. Болбаса, А. І. Снапковай, У. Н. Сідарцова.

Школьная гістарычная адукацыя пазіцыяніруецца як комплексная педагагічная сістэма на I, II, III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі з улікам прапедэўтычнага навучання. Яна вывучаецца комплексна як інстытуцыянальна-ведамасная сістэма і сацыягуманітарная з'ява ў працэсе свайго станаўлення і развіцця. Удакладненымі структурнымі кампанентамі школьнай гістарычнай адукацыі вызначаны канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, змястава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны.

*Канцэптуальна-метадалагічны кампанент* і адпаведны яму фактар развіцця школьнай гістарычнай адукацыі звязаны з нарматыўна-прававой распрацоўкай яе канцэптуальных асноў. Дадзеныя асновы разглядаюцца комплексна адносна школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і сацыягуманітарнай з'явы. У межах інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы асвятляюцца прадстаўленыя ў школьнай вучэбнай літаратуры метадалагічныя падыходы акадэмічнай

гістарычнай навукі да разумення грамадска-гістарычнага працэсу (фармацыйны і мадэрнізацыйны). Таксама абгрунтавана пераемнасць у рэалізацыі метадалагічных агульнапедагагічных (культуралагічнага і кампетэнтнаснага) падыходаў пры фарміраванні ў вучняў вопыту творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін да гістарычных падзей і іх удзельнікаў. Пры гэтым улічваецца мэтазгоднасць фарміравання ўніверсальных кампетэнцый крэатыўнага мыслення і эмацыянальнай рэгуляцыі згодна з праектам Канцэпцыі фарміравання ўніверсальных кампетэнцый дзяцей і вучнёўскай моладзі (распрацоўшчыкі В. Ф. Русецкі, В. Р. Стуканаў, Г. В. Торхава і інш.).

Змест школьнай гістарычнай адукацыі пазіцыяніруецца як педагагічна адаптаваны сацыяльны вопыт чалавецтва, у тым ліку беларускага народа, з улікам канцэптуальнага палажэння расійскага вучонага А. М. Новікава аб культуры як аснове зместу адукацыі. У якасці метадалагічнай асновы даследавання выкарыстана культуралагічная канцэпцыя зместу адукацыі (І. Я. Лернер, М. М. Скаткін, В. В. Краеўскі), якая прадвызначае яе чатырохкампанентны склад. Пры засваенні зместу адукацыі як сацыяльнага вопыту ў вучняў фарміруюцца рэгулятары іх сацыяльных паводзін і маркеры нацыянальна-культурнай, тэрытарыяльнай і дзяржаўнай ідэнтычнасці.

Школьная гістарычная адукацыя як сацыягуманітарная з'ява характарызуецца міждысцыплінарнымі канцэптамі гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства. Дадзеныя міждысцыплінарныя канцэпты пазіцыяніруюцца як вызначальныя ў працэсе фарміравання адпаведных ім інтэграваных якасцей асобы.

Канцэптуальныя асновы школьнай гістарычнай адукацыі эвалюцыянавалі ад вузкапрадметнай арыентаванасці і палітызаванасці ў першай палове 1990-х гг. да пазіцыяніравання школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай шматкампанентнай педагагічнай сістэмы.

Ахарактарызаваныя *інстытуцыянальна-функцыянальны кампанент* і адпаведны яму фактар развіцця школьнай гістарычнай адукацыі адлюстроўваюць дзяржаўную гістарычную палітыку. Яна накіравана на замацаванне ў Рэспубліцы Беларусь беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці. Улічана характарыстыка дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, прадстаўленая акадэмікам НАН Беларусі А. А. Каваленяй. Мэты і



задачы, прынцыпы абнаўлення зместу адукацыі і яго структуравання, функцыянал школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы, што пазіцыяніруюцца ў якасці яе канцэптуальных асноў, эвалюцыянавалі ад пераважна этнанацыянальных да нацыянальна-дзяржаўных характарыстык.

*Змястава-дзейнасны кампанент* і адпаведны яму фактар развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ахарактарызаваны з улікам рэалізацыі метадалагічных прадметна-гістарычных (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны) падыходаў да канструявання зместу ва ўмовах набыцця гісторыяй Беларусі статусу самастойнага вучэбнага прадмета і рэалізацыі яго нацыястваральнага патэнцыялу. У межах змястава-дзейнаснага кампанента прадстаўляюцца структура зместу школьнай гістарычнай адукацыі (ведавы, дзейнасны, эмацыянальна-каштоўнасны кампаненты) і прынцыпы яго адбору, змястоўныя лініі і напаўненне міждысцыплінарных канцэптаў. Пры гэтым комплексна ўлічваюцца: асвятленне ролі асобы ў гісторыі і ўзораў яе паводзін; траістая прырода навукова-гістарычнага факта як рэальнай падзеі мінулага, адлюстраванага ў крыніцах фрагмента гістарычнай рэчаіснасці, аб'екта дзейнасці вучонага-гісторыка. Характарызуюцца магчымасці інтэрпрэтацыі навукова-гістарычнага факта і яго рэканструкцыі ў межах гістарычнай рэтраальтэрнатывістыкі; спосабы дзейнасці, звязаныя з развіццём гістарычнага мыслення і выкарыстаннем гістарычных першакрыніц; роля міфаў у школьнай гістарычнай адукацыі.

Ахарактарызаваныя *сацыяльна-аксіялагічны кампанент* і адпаведны яму фактар развіцця школьнай гістарычнай адукацыі абумоўлены трансляцыяй і прысваеннем вучнямі сістэмы традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства. Сацыяльна-аксіялагічны кампанент актуалізуецца выхаваннем у вучняў патрыятызму і грамадзянскасці.

У другой главе **«Школьная гістарычная адукацыя як інстытуцыянальна-ведамасная сістэма»** прадстаўлена структурна-змястоўная мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі; вызначаны этапы яе развіцця ў Рэспубліцы Беларусь; ахарактарызавана эвалюцыя, якая адбылася ў канцэптуальным мэтавызначэнні, прынцыпах абнаўлення і структуравання зместу, функцыянале.

Прадстаўленыя ў мадэлі структурныя кампаненты школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы і вызначальныя фактары яе развіцця адпавядаюць адзін аднаму. Вынікам выкарыстання мадэлі як інструмента гісторыка-педагагічнага даследавання школьнай

гістарычнай адукацыі з'яўляецца вызначэнне канцэптуальных асноў яе развіцця як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і як сацыягуманітарнай з'явы *(малюнак)*.

У главе 2 паказаны этапы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, якія комплексна ўлічваюць нарматыўна-прававую распрацоўку яе канцэптуальных асноў у трох пакаленнях канцэпцый і адукацыйных стандартаў; структураванне зместу адукацыі па канцэнтрычным і лінейным прынцыпах; канструяванне зместу ў пяці пакаленнях школьнай вучэбнай літаратуры; рэалізацыю культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў; афармленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.

Этапная перыядызацыя працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь вызначана наступным чынам.

*Канцэптуальна-вызначальны этап* (1991–1997 гг.) звязаны з распрацоўкай Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі аўтарскім калектывам пад кіраўніцтвам М. В. Біча (1991 г.), наданнем гісторыі Беларусі статусу самастойнага вучэбнага прадмета (1992 г.), падрыхтоўкай першага пакалення школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры (з 1993 г.), са стварэннем Дзяржаўнай камісіі па падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў у гуманітарна-грамадазнаўчай сферы (1995 г.).

Да *метадычна-стваральнага этапу* (1998–2008 гг.) адносяцца сістэмная распрацоўка метадычнага апарата школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры ва ўмовах пераходу з 1998 г. агульнаадукацыйнай школы на 12-гадовы тэрмін навучання, рэалізацыя канцэнтрычнага прынцыпу структуравання зместу, увядзенне ў дзеянне адукацыйнага стандарту агульнай сярэдняй адукацыі (1998 г.).

*Канцэптуальна-прадметны этап* (2009–2014 гг.) звязаны з зацвярджэннем Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» і яго адукацыйнага стандарту (2009 г.), падрыхтоўкай школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры ва ўмовах вяртання агульнаадукацыйнай школы на 11-гадовы тэрмін навучання і паступовага пераходу ад канцэнтрычнага да лінейнага прынцыпу структуравання зместу.

*Кампетэнтнасна-арыентаваны этап* (2015–2022 гг.) распачаўся з рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ва ўмовах пераходу ад лінейнага да канцэнтрычнага прынцыпу структуравання зместу. У 2018 г. уводзіцца ў дзеянне адукацыйны стандарт агульнай сярэдняй адукацыі. У 2022 г. створаны Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адобрана Канцэпцыя школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.






**Малюнак. – Структурна-зместавая мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь**

З 2023 г. пачынаецца этап ажыццяўлення згаданай Канцэпцыі ва ўмовах рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь і стварэнне інтэграванага курса «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

У главе 2 прадстаўлены выяўленыя тэндэнцыі ў мэтавызначэнні, прынцыпах абнаўлення зместу адукацыі і яго структуравання, функцыянале школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы.

*Тэндэнцыя ў канцэптуальным мэтавызначэнні* сведчыць аб пераходзе ад накіраванасці на авалодванне прадметнымі ведамі да арыентаванасці на развіццё і самаразвіццё вучня ў працэсе дасягнення асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў з улікам фарміравання гістарычнай памяці і нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці як інтэграваных якасцей асобы на аснове засваення ёю сацыяльна значнага гістарычнага вопыту.

*Тэндэнцыя ў прынцыпах абнаўлення зместу* школьнай гістарычнай адукацыі, пададзеных у трох пакаленнях канцэпцый, сведчыць аб іх сэнсава-зместавай пераемнасці, комплексным характары, актуалізацыі прынцыпаў адзінства выхавання і навучання, дыскрэтнасці, даступнасці, вобразнасці і антрапалагізацыі, рэалізацыі прынцыпаў культурна-гістарычнага асяроддзя і гістарычнай дыялагічнасці.

*Тэндэнцыя ў структураванні зместу* школьнай гістарычнай адукацыі сведчыць аб цыклічным характары рэалізацыі канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў пры вызначэнні парадку вывучэння гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі на ІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі ва ўзаемасувязі з прапедэўтычным навучаннем на І ступені (вучэбны прадмет «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», IV клас). Канцэнтрычны прынцып першапачаткова рэалізаваны ў 1992–2008 гг. у межах 11-гадовага навучання (з 1998 г. у працэсе пераходу на 12-гадовы тэрмін навучання), а затым – з 2015 г. у межах вяртання да 11-гадовага тэрміну навучання. Лінейны прынцып структуравання зместу рэалізаваны ў 2009—2014 гг. Вынікі анкетавання (лістапад 2017 г. – красавік 2022 г.) прафесійных адносін настаўнікаў гісторыі (612 рэспандэнтаў) да рэалізацыі ў VII–XI класах лінейнага і канцэнтрычнага прынцыпаў структуравання зместу сведчаць аб прыярытэтнасці канцэнтрычнага прынцыпу. Структураванне зместу школьнай гістарычнай адукацыі мае комплексны характар пры вызначэнні падзейна-храналагічнага і праблемна-тэарэтычнага ўзроўняў сістэмнага вывучэння гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі адпаведна на ІІ і ІІІ ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.



*Тэндэнцыя, звязаная з функцыяналам* школьнай гістарычнай адукацыі, сведчыць аб яго комплексным характары пры захаванні традыцыйных функцый (гісторыка-пазнавальная, навучальная, развіццёвая, выхаваўчая, сацыялізуючая). Актуалізуюцца наступныя функцыі: светапоглядная (фарміраванне гістарычнай памяці, нацыянальнай ідэнтычнасці, адказнасці асобы за свае дзеянні перад грамадствам і дзяржавай); кансерватыўна-пераемная (захаванне гістарычнай памяці з забеспячэннем яе кансалідаванай ролі); дзейнасна-паводзінская (выкарыстанне вучнямі ў сваіх сацыяльных практыках канкрэтна-гістарычных аналагаў паводзін чалавека ў гісторыі, якія абраны ў якасці маральных арыенціраў); фарміраванне функцыянальнай адукаванасці.

У трэцяй главе **«Школьная гістарычная адукацыя як сацыягуманітарная з'ява»** прадстаўлены міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства.

Пры фарміраванні гістарычнай памяці ўлічваецца тэарэтычна распрацаванае беларускім сацыёлагам А. І. Ляўко палажэнне аб адукацыі як сацыякультурным фактары гістарычнай спадчыны і пераемнасці розных пакаленняў. Прыводзяцца прыклады распрацоўкі *канцэпту гістарычнай памяці*, характарыстыкі якога належаць французскім і нямецкім даследчыкам М. Хальбваксу (фр. Maurice Halbwachs), П. Нара (фр. Pierre Nora), Я. Асману і А. Асман (ням. Jan Assmann, Aleida Assmann). Канцэпт гістарычнай памяці актуалізаваны патрабаваннямі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, абумоўлены фарміраваннем уласна беларускай мадэлі гістарычнай памяці, якая пры сваім навукова-тэарэтычным вызначэнні канкрэтызуецца беларускім сацыёлагам М. Л. Мысліўцом. Адзначаецца, што гістарычная памяць патэнцыяльна патрабуе сваёй трансфармацыі з інстытуцыянальнай сацыяльна-педагагічнай катэгорыі ў інтэгратыўную якасць асобы вучня. Зместавае напаўненне канцэпту гістарычнай памяці прагнастычна ўлічваецца пры распрацоўцы намінацыі «Нацыянальны герой» і стварэнні ў Рэспубліцы Беларусь пантэона нацыянальных герояў. Канцэптуальнае значэнне мае захаванне гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, якое рэалізуецца праз стварэнне адпаведнага вучэбна-метадычнага комплексу.

*Канцэпты нацыі і нацыянальнай ідэі* ў сваёй арганічнай узаемасувязі ўлічваюць гістарычную рэтраспектыву іх фарміравання, прадстаўленую ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі, і сучасную іх эвалюцыю ў кірунку грамадзянскай нацыі і афармлення агульнанацыянальнай ідэі

як светапогляднай асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. Сутнасць і змест нацыянальнай ідэі намінатыўна прадстаўлены праз іх тэарэтычнае абгрунтаванне ў навукова-педагагічным супольніцтве (даследаванні А. Г. Слукі, Л. Н. Ціханава, У. А. Мельніка, А. В. Русецкага, Я. С. Яскевіч, І. А. Марзалюка) і рэалізацыю ў адукацыйным асяроддзі Рэспублікі Беларусь. Мэтазгодна ўлічыць пры канструяванні школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь пазіцыяніраванне расійскім даследчыкам А. В. Хутарскім нацыянальнай ідэі як асновы для канструявання педагогікі і дыдактыкі.

*Канцэпт беларускай дзяржаўнасці,* распрацаваны айчыннымі вучонымі-гісторыкамі А. А. Каваленяй, В. В. Даніловічам, М. У. Смяховічам і канкрэтызаваны В. А. Белазаровічам у нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, адлюстраваны на навукова-тэарэтычным і канкрэтна-храналагічным узроўнях. Прааналізавана зместавае напаўненне ў школьнай гістарычнай адукацыі канцэпту беларускай дзяржаўнасці ў спалучэнні яе гістарычных і нацыянальных форм (Полацкае і Тураўскае княствы; Старажытная Русь; Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае, у тым ліку ў складзе Рэчы Паспалітай; беларускія губерні ў складзе Расійскай імперыі; абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі; стварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (затым – БССР) і яе развіццё ў складзе Савецкага Саюза з улікам уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР; суверэнная Рэспубліка Беларусь). Канцэпт беларускай дзяржаўнасці пры яго прадстаўленні ў змесце адукацыі і засваенні накіраваны на фарміраванне ідэнтычнасці вучняў як прадстаўнікоў сучаснай беларускай грамадзянскай нацыі і грамадзян Рэспублікі Беларусь.

У главе 3 прыводзяцца вынікі анкетавання (лістапад 2018 г. – красавік 2022 г.) асабістых адносін настаўнікаў гісторыі (501 рэспандэнт) да гістарычных і нацыянальных форм дзяржаўнасці, якія існавалі ў розныя перыяды грамадска-гістарычнага развіцця Беларусі і вывучаліся ў VI–IX класах. Аналіз вынікаў анкетавання сведчыць, што найбольшыя пазітыўныя адносіны настаўнікаў (91,4 % рэспандэнтаў) звязаны з усходнеславянскім перыядам дзяржаўнасці і канцэптам Полацкага княства як яе першай гістарычнай формай на тэрыторыі Беларусі. Найбольшую цікавасць у настаўнікаў выклікае перыяд знаходжання беларускіх земель у складзе Вялікага Княства Літоўскага. ВКЛ прадстаўляецца ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі ва ўсходнеславянскім і ўсходнееўрапейскім кантэкстах як гістарычная форма дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі.



*Канцэпт традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства* прадстаўлены ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі праз канкрэтныя прыклады сацыяльных паводзін чалавека ў гісторыі, рэгулятарамі якіх з'яўляліся традыцыйныя каштоўнасці. Яны ўлічваюцца ў працэссе канструявання сацыяльна-аксіялагічнага зместу школьнай гістарычнай адукацыі. Пры адлюстраванні каштоўнасных арыентацый беларускай вучнёўскай моладзі ўлічаны вынікі маніторынгаў пад кіраваннем беларускага сацыёлага Д. Г. Ротмана, а таксама даследаванне асобаснага развіцця і ўзроўню выхаванасці вучняў IX, XI класаў, праведзенае Нацыянальным інстытутам адукацыі (І. П. Жаголь-Лабзеева).

У чацвёртай главе **«Перспектывы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь»** характарызуецца нацыястваральны патэнцыял гісторыі Беларусі; канкрэтызуецца выхаваўчы функцыянал школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь; прадстаўляецца зместавае напаўненне працэсу фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў сродкамі гісторыі Беларусі; удакладняюцца прынцыпы адбору зместу школьнай гістарычнай адукацыі. У змесце главы ўлічаны даследаванні доктара педагагічных навук прафесара В. Ф. Русецкага па праблеме прагнастычнага патэнцыялу ў развіцці адукацыі.

Адзначаецца, што *рэалізацыя нацыястваральнага патэнцыялу гісторыяй Беларусі* адбываецца пры фарміраванні ўласна беларускага вобраза гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці праз увасабленне ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі канцэптаў беларускай дзяржаўнасці, грамадзянскай нацыі, нацыянальнай ідэі.

*Рэалізацыя светапоглядна-выхаваўчай ролі* школьнай гістарычнай адукацыі мэтазгодна з улікам сацыяльна-педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі. Згаданая мадэль уключае духоўна-маральны, нацыянальна-дзяржаўны, адукацыйна-прафесійны, аздараўленча-спартыўны кампаненты і пры сваёй рэалізацыі прадугледжвае этнанацыянальны, культурна-гістарычны, сацыякультурны, аксіялагічны кантэксты. Бяруцца да ўвагі вызначэнне патрыятызму як педагагічнай каштоўнасці айчыннымі даследчыкамі В. У. Буткевіч, В. С. Болбасам і асаблівасці сучаснага ваенна-патрыятычнага выхавання, актуалізаваныя айчынным вучоным В. Р. Стуканавым.

*Канцэпт нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці* вучняў прадугледжвае яго вызначэнне як сацыяльна-педагагічнай катэгорыі ў складзе канкрэтнай эмацыянальна-псіхалагічнай, палітыка-ідэалагічнай,

культураадпаведнай пазіцыі асобы. Пры гэтым прымаецца да ўвагі меркаванне доктара педагагічных навук прафесара Ф. У. Кадола як аўтара канцэпцыі фарміравання маральных якасцей вучняў пра тое, што менавіта эмацыянальна-пачуццёвы кампанент асобы з'яўляецца вызначальным пры фарміраванні якасцей асобы. Таксама ўлічваецца вызначэнне ідэнтычнасці ў якасці сацыяльна-педагагічнай катэгорыі расійскім даследчыкам В. А. Сласцёніным, характарыстыка ідэнтычнасці беларусаў і яе эвалюцыі, якая належыць айчынным даследчыкам Я. М. Бабосаву, А. І. Ляўко, Л. Р. Цітарэнцы, Л. М. Таранцей, вызначэнне тэрытарыяльна-культурнай ідэнтычнасці айчынным вучоным І. Я. Левяшом. Пры рэалізацыі канцэпту нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці працэс нацыянальнай ідэнтыфікацыі асобы адбываецца як праз адмежаванне, так і праз упадабленне прапанаваным узорам паводзін. У дадзеным працэсе прадугледжваецца паказ прыкладаў учынкаў прадстаўнікоў беларускай нацыі ў якасці культурна-гістарычных аналагаў сацыяльных паводзін, што могуць быць выкарыстаны як узоры паводзін з улікам сістэмы традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства. Рэалізацыя канцэпту нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў адбываецца з улікам ролі падручніка айчыннай гісторыі, вызначанай айчынным вучоным-гісторыкам І. А. Марзалюком, і прадугледжвае эвалюцыю зместавых маркераў ад тэрытарыяльна-культурных («ліцвінскасць» і «тутэйшасць», пераважная намінацыя «Наш славуты зямляк») да нацыянальна-дзяржаўных (грамадзянства і грамадзянскасць, патэнцыяльная намінацыя «Нацыянальны герой»). Ва ўзаемасувязі з канцэптам нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці характарызуецца рэалізацыя прынцыпу мультыкультурнасці як разнастайнасці культур з адлюстраваннем тэрытарыяльна-культурнага аспекту ідэнтычнасці праз феномен «тутэйшасці».

Аналіз вынікаў анкетавання (лістапад 2021 г. – сакавік 2022 г.) эмацыянальна-каштоўнасных адносін настаўнікаў гісторыі (138 рэспандэнтаў) да прадстаўнікоў беларускай нацыі, прадстаўленых у змесце школьнай гістарычнай адукацыі ў IX класе пры вывучэнні гісторыі Беларусі 1917 г. – пачатку XXI ст., сведчыць аб станоўчых адносінах да ролі асобы ў гісторыі Беларусі Найноўшага часу. Больш за 90 % настаўнікаў вызначылі такіх дзеячаў, як партызанскі камандзір М. П. Шмыроў (Бацька Мінай), партыйны кіраўнік у БССР П. М. Машэраў, народныя пісьменнікі Беларусі В. У. Быкаў і І. П. Мележ, У. С. Караткевіч, народны мастак



Беларусі М. А. Савіцкі. Больш за 60 % рэспандэнтаў адзначылі, што дзве асобы (П. М. Машэраў, В. У. Быкаў) заслугоўваюць быць у пантэоне нацыянальных герояў Беларусі.

У главе 4 прыводзяцца вынікі анкетавання (лістапад 2018 г. – красавік 2022 г.) асабістых адносін настаўнікаў гісторыі (501 рэспандэнт) да гістарычных працэсаў савецкага часу з улікам трансляцыі прыкладаў савецкага тыпу беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці як часткі сацыяльнага вопыту сучаснай беларускай нацыі. Пераважная большасць пазітыўных ацэнак настаўнікаў звязана з дзяржаўна-ўтваральным працэсам, напрыклад: са скліканнем Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 г., стварэннем Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі, з удзелам Беларусі ў стварэнні Савецкага Саюза, правядзеннем палітыкі беларусізацыі, уз'яднаннем Заходняй Беларусі з БССР, прыняццем Дэкларацыі аб Дзяржаўным суверэнітэце БССР 27.07.1990. 100-працэнтны паказчык мае Вялікая Перамога савецкага, у тым ліку беларускага, народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

У главе 4 прадстаўлены ўдакладненыя *прынцыпы адбору зместу школьнай гістарычнай адукацыі,* якія маюць комплексны характар. Сярод іх: даступнасць, што прадвызначае перавод акадэмічных навукова-тэарэтычных ведаў у вучэбныя праз канструяванне сацыяльна значнай і эмацыянальна афарбаванай для вучняў вучэбнай інфармацыі; зместавая цэласнасць пры ўдакладненні зместавых ліній як педагагічнага механізма канструявання зместу; інструментальнасць пры ажыццяўленні акадэмічна-гістарычных і прадметна-гістарычных падыходаў; аксіялагічнасць пры ўліку сістэмы каштоўнасных арыентацый вучняў; комплекснасць пры пераадоленні празмернай факталагічнасці вучэбнага гістарычнага матэрыялу праз яго структураванне ў адпаведнасці з канцэнтрамі, дэдуктыўным і індуктыўным алгарытмамі засваення зместу, задачай фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў; міжпрадметнасць пры інтэграцыі гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

**1.** Вызначана, што спецыфіка гісторыка-педагагічнага даследавання школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай шматкампанентнай і шматфактарнай педагагічнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь мае міждысцыплінарны характар.

Дадзеная спецыфіка абумоўлена *метадалагічнымі асаблівасцямі гісторыі адукацыі* (педагагічнасць, гістарычнасць, культуралагічнасць, сацыялагічнасць, паліталагічнасць, антрапалагічнасць, філасафічнасць) у спалучэнні з *метадалагічнымі прынцыпамі гістарычнага пазнання.* Гэтыя прынцыпы ўлічваюць асаблівасці сацыяльна-гуманітарных ведаў (навуковасць, гістарызм, аб'ектыўнасць, прычыннаабумоўленасць, сістэмнасць, альтэрнатыўнасць, лагічнае абгрунтаванне, гуманізм у ацэначных меркаваннях, шматфактарнасць). Міждысцыплінарны характар даследавання комплексна ўлічвае канцэпты акадэмічнай гісторыі (беларуская дзяржаўнасць), паліталогіі (нацыя і нацыянальная ідэя), сацыялогіі (гістарычная памяць, нацыянальна-культурная ідэнтычнасць, традыцыйныя каштоўнасці). Адзначаная спецыфіка характарызуецца інтэграванасцю школьнай гістарычнай адукацыі ў сістэму грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных, духоўна-культурных рэалій Рэспублікі Беларусь. Міждысцыплінарную спецыфіку гісторыка-педагагічнага даследавання прадвызначае шматфункцыянальны характар школьнай гістарычнай адукацыі (функцыі пазнання гістарычнай рэтраспектывы для тлумачэння сучасных з'яў; трансляцыі сістэмы традыцыйных каштоўнасцей у якасці сацыяльных рэгулятываў; сацыялізацыі асобы вучня з улікам фарміравання патрыятызму і грамадзянскасці, гістарычнай памяці, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці).

Школьная гістарычная адукацыя як комплексная педагагічная сістэма на I, II, III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь у сваіх структурных кампанентах суадносіцца з фактарамі, якія іх дэтэрмінуюць і заключаецца ў наступным.

*Канцэптуальна-метадалагічны кампанент* прадвызначаны працэсам нарматыўна-прававой распрацоўкі канцэптуальных асноў, улічвае метадалагічныя агульнапедагагічныя і акадэмічна-гістарычныя падыходы, якія эвалюцыянавалі ад вузкапрадметнай арыентаванасці і палітызаванасці ў першай палове 1990-х гг. да пазіцыяніравання школьнай гістарычнай адукацыі як шматкампанентнай педагагічнай сістэмы. Рэалізацыя згаданых падыходаў абумоўлівае паступовы пераход ад традыцыйна



прадметацэнтрычнага навучання гісторыі, арыентаванага на набыццё і перадачу ведаў, да асобасна-арыентаванага, што прадугледжвае вызначэнне інтэгратыўнымі якасцямі асобы гістарычнай памяці і нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. У складзе канцэптуальна-метадалагічнага кампанента школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы вызначаюцца міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства.

*Інстытуцыянальна-функцыянальны кампанент* абумоўлены ажыццяўленнем дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, арыентаванай на замацаванне ў Рэспубліцы Беларусь беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці. Дадзеныя канцэпцыя і мадэль эвалюцыянавалі ад пераважна этнакультурных да нацыянальна-дзяржаўных канцэптаў з улікам мэтавызначэння, функцыяналу, прынцыпаў абнаўлення зместу і яго структуравання.

*Зместава-дзейнасны кампанент* дэтэрмінаваны ажыццяўленнем нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі ва ўмовах набыцця ёю статусу самастойнага вучэбнага прадмета на парытэтных асновах з сусветнай гісторыяй. Зместава-дзейнасны кампанент улічвае метадалагічныя прадметна-гістарычныя (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны) падыходы да канструявання і засваення зместу з улікам спосабаў дзейнасці, што адпавядаюць згаданым падыходам. Зместава-дзейнасны кампанент улічвае спецыфіку навукова-гістарычнага факта, шматкампанентную структуру зместу школьнай гістарычнай адукацыі і прынцыпы для яго адбору, зместавыя лініі адукацыйнага стандарту 1998 г. і канцэпцыі 2022 г. У складзе зместава-дзейнаснага кампанента прысутнічае зместавае напаўненне міждысцыплінарных канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства.

*Сацыяльна-аксіялагічны кампанент* абумоўлены зменай механізмаў сучаснай міжпакаленнай камунікацыі ў працэсе трансляцыі педагагічна адаптаванага сацыяльнага вопыту чалавецтва і беларускага народа як зместу адукацыі. Дадзены кампанент улічвае захаванне гістарычнай памяці і прыняцце вучнямі як жыхарамі Беларусі і грамадзянамі Рэспублікі Беларусь сістэмы традыцыйных каштоўнасцей і дасягненняў беларускай нацыі, каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту, якія з'яўляюцца рэгулятарамі сацыяльных паводзін і маркерамі нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. Сацыяльна-аксіялагічны кампанент актуалізаваны

фарміраваннем інтэгратыўных якасцей асобы, сярод якіх – патрыятызм і грамадзянскасць [1–А; 17–А; 19–А; 22–А; 25–А; 26–А; 30–А – 32–А; 42–А; 43–А; 49–А; 60–А; 68–А; 71–А; 73–А – 76–А].

**2.** Сістэматызавана сукупнасць метадалагічных падыходаў як комплексных педагагічных сродкаў, якія рэалізуюцца ў школьнай гістарычнай адукацыі.

*Агульнапедагагічныя падыходы* (культуралагічны і кампетэнтнасны) рэалізаваны ў школьнай гістарычнай адукацыі з улікам пераемнасці пры фарміраванні ў вучняў вопыту творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін, што суадносяцца з кампетэнцыямі крэатыўнага мыслення і эмацыянальнай рэгуляцыі згодна з праектам Канцэпцыі фарміравання ўніверсальных кампетэнцый дзяцей і вучнёўскай моладзі.

*Падыходы акадэмічнай гістарычнай навукі* (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны) да разумення грамадска-гістарычнага працэсу рэалізаваны з улікам спецыфікі навуковага гістарычнага факта (як рэальнай падзеі мінулага; адлюстраванага ў крыніцах фрагмента гістарычнай рэчаіснасці; аб'екта дзейнасці вучонага-гісторыка) і эвалюцыянавалі ад этнакультурнай да нацыянальна-дзяржаўнай дамінанты, што звязана з рэалізацыяй канцэпту беларускай дзяржаўнасці ў яе гістарычных і нацыянальных формах.

*Прадметна-гістарычныя падыходы* да канструявання зместу ў сваім комплексе прадстаўляюць:

– *гісторыка-крыніцазнаўчы падыход* – прадвызначае ўжыванне разнажанравых гістарычных першакрыніц, у сваім патэнцыяле ўлічвае магчымасць тэарэтычнага абагульнення і дыялагічнай інтэрпрэтацыі навукова-гістарычнага факта як дынамічнай пазнавальнай канструкцыі, у якой спалучаюцца аб'ектыўныя (інфармацыя самой крыніцы) і суб'ектыўныя (інтэрпрэтацыя даследчыка, настаўніка, вучня) элементы. Пры рэалізацыі дадзенага падыходу патэнцыяльна магчымы разгляд альтэрнатыўных сітуацый пры тэарэтычным асэнсаванні варыянтаў грамадскага развіцця ў гістарычным мінулым;

– *гісторыка-антрапалагічны падыход* – абумоўлівае паказ культурна-гістарычных узораў сацыяльных паводзін чалавека ў гісторыі і ў сваім патэнцыяле спалучае фармальна-фактапагічнае біяграфічнае апісанне ролі гістарычных асоб з улікам магчымасцей складання іх біяграм;

– *гісторыка-аксіялагічны падыход* – улічвае вынікі сацыялагічных даследаванняў сістэмы каштоўнасцей, што падзяляюцца вучнямі як прадстаўнікамі сучаснага беларускага грамадства, у якасці праксеалагічных крытэрыяў адбору зместу адукацыі.



Прадметна-гістарычныя падыходы рэалізуюцца з улікам наступных *структурных кампанентаў зместу школьнай гістарычнай адукацыі*:

– *ведавы*, які ўключае ў сябе факталагічныя, тэарэтычныя, ацэначныя, метадалагічныя веды і веды аб спосабах дзейнасці, змяшчае заканамернасці і працэсы грамадска-гістарычнага развіцця, паняційна-тэрміналагічны апарат высокай ступені абагульненасці;

– *дзейнасны*, які прадугледжвае фарміраванне ў вучняў комплексу спосабаў дзейнасці з факталагічнымі, тэарэтычнымі, ацэначнымі кампанентамі зместу вучэбнага матэрыялу, што з'яўляюцца асновай для дасягнення вучнямі метапрадметных і прадметных вынікаў навучання;

– *эмацыянальна-каштоўнасны*, які скіраваны на фарміраванне ў вучняў вопыту адносін да свету і зместу гістарычнага матэрыялу, што вывучаецца на аснове сістэмы значных для асобы і грамадства каштоўнасных арыенціраў, і ўвасабляецца ў дасягненні сацыяльна-асобасных вынікаў [1–А; 5–А; 6–А – 9–А; 11–А – 15–А; 31–А; 33–А; 35–А – 37–А; 49–А; 51–А; 52–А; 55–А; 58–А; 69–А; 71–А; 74–А; 75–А; 78–А; 80–А – 83–А].

**3.** Сканструявана структурна-зместавая мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, якая мае інструментальны характар.

*Канцэптуальна-метадалагічны кампанент мадэлі* грунтуецца на спалучэнні гісторыка-педагагічнага даследавання з улікам яго міждысцыплінарнай спецыфікі і прынцыпаў гістарычнага пазнання, прадугледжвае нарматыўна-прававое вызначэнне канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі, пададзенае ў трох пакаленнях канцэпцый 1991, 2009, 2022 гг.; азнаямленне з рэалізацыяй у змесце школьнай гістарычнай адукацыі агульнапедагагічных (культуралагічнага і кампетэнтнаснага ў іх спалучэнні) і акадэмічна-гістарычных (фармацыйнага, мадэрнізацыйнага, цывілізацыйнага) падыходаў; вызначэнне прадстаўленых у навукова-педагагічным і адукацыйным асяроддзі міждысцыплінарных канцэптаў акадэмічнай гісторыі, паліталогіі, сацыялогіі (беларускай дзяржаўнасці, гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства).

*Інстытуцыянальна-функцыянальны кампанент мадэлі* прызначаны для вывучэння працэсу афармлення ў Рэспубліцы Беларусь дзяржаўнай гістарычнай палітыкі і яе патрабаванняў у галіне школьнай гістарычнай адукацыі; эвалюцыі ў яе мэтавызначэнні, прынцыпах абнаўлення зместу

і структуравання (па лінейным і канцэнтрычным прынцыпах); змен у функцыянале; перыядызацыі і тэндэнцый развіцця.

*Змества-дзейнасны кампанент мадэлі* прызначаны для вывучэння рэалізацыі прадметна-гістарычных (гісторыка-крыніцазнаўчага, гісторыка-антрапалагічнага, гісторыка-аксіялагічнага) падыходаў пры ўліку нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі, спецыфікі навукова-гістарычнага факта, шматкампанентнай структуры зместу школьнай гістарычнай адукацыі, удакладнення яе зместавых ліній (у адукацыйным стандарце 1998 г. і канцэпцыі 2022 г.) і падстаў для адбору зместу.

*Сацыяльна-аксіялагічны кампанент мадэлі* ўлічвае светапоглядна-выхаваўчую ролю школьнай гістарычнай адукацыі пры трансляцыі сацыяльнага вопыту ў працэсе фарміравання патрыятызму і грамадзянскасці ў вучняў, іх арыентацыі на традыцыйныя каштоўнасці беларускага грамадства ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі; прадугледжвае выяўленне асабістых адносін настаўнікаў і вучняў да гістарычных падзей і іх удзельнікаў, адлюстраваных у вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі, а таксама прафесійных адносін настаўнікаў да лінейнага і канцэнтрычнага прынцыпаў структуравання зместу [1–А; 17–А; 19–А; 22–А; 25–А; 27–А; 31–А; 42–А; 60–А; 68–А; 69–А; 73–А].

**4.** Распрацавана чатырохэтапная перыядызацыя працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, якая грунтуецца на комплексным характары паказчыкаў, што ўлічваюць рэпрэзентатыўныя падзеі і працэсы з пункта гледжання магчымасцей іх сучаснага асэнсавання. Гэта – нарматыўна-прававая распрацоўка канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі ў трох пакаленнях канцэпцый; падрыхтоўка трох пакаленняў адукацыйных стандартаў; структураванне зместу адукацыі па канцэнтрычным і лінейным прынцыпах; канструяванне зместу ў пяці пакаленнях вучэбнай літаратуры; рэалізацыя культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў; афармленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.

Вызначаныя этапы характарызуюцца наступным чынам.

*Канцэптуальна-вызначальны* этап (1991–1997 гг.) звязаны з распрацоўкай Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі (1991 г.), у якой абвяшчаліся прынцыпы абнаўлення зместу школьнай гістарычнай адукацыі (дэпартызацыя і дэідэалагізацыя, гуманізацыя і плюралізм, канцэнтрызм у навучанні, адзінства айчыннай і сусветнай гісторыі, спалучэнне фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да разумення



грамадска-гістарычных працэсаў); з наданнем гісторыі Беларусі статусу самастойнага вучэбнага прадмета (1992 г.); з падрыхтоўкай першага пакалення вучэбных дапаможнікаў па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі, вучэбным прадмеце «Мая Радзіма – Беларусь» (з 1993 г.); са стварэннем Дзяржаўнай камісіі па падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў у гуманітарна-грамадазнаўчай сферы (1995 г.).

*Метадычна-стваральны* этап (1998–2008 гг.) змяшчае ў сабе падрыхтоўку на нацыянальна-дзяржаўнай аснове другога і трэцяга (з 2003 г.) пакаленняў вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі, вучэбным прадмеце «Мая Радзіма – Беларусь», у тым ліку створаных альтэрнатыўнымі аўтарскімі калектывамі, з распрацаваным метадычным апаратам ва ўмовах пераходу з 1998 г. агульнаадукацыйнай школы на 12-гадовы тэрмін навучання і рэалізацыі канцэнтрычнага прынцыпу структуравання зместу школьнай гістарычнай адукацыі; увядзенне ў дзеянне (1998 г.) адукацыйнага стандарту агульнай сярэдняй адукацыі па блоку сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (адукацыйная вобласць «Гісторыя», вучэбныя курсы «Сусветная гісторыя» і «Гісторыя Беларусі»).

*Канцэптуальна-прадметны этап* (2009–2014 гг.) уключае зацвярджэнне Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» і яго адукацыйнага стандарту (2009 г.), дзе вызначаліся прынцыпы абнаўлення зместу школьнай гістарычнай адукацыі (гістарызм; метадалагічны плюралізм; культурна-гістарычнае асяроддзе; навуковая аб'ектыўнасць; вядучая роля тэарэтычных ведаў; спалучэнне фармалізаваных і нефармалізаваных гістарычных ведаў; сістэматычнасць і пераемнасць паміж ступенямі навучання гісторыі ў пачатковай, базавай і сярэдняй школе; даступнасць у навучанні; міждысцыплінарнасць; вывучэнне гісторыі Беларусі ў кантэксце рэгіянальнай і сусветнай гісторыі). Пералічаныя прынцыпы сталі зыходнымі пры зместавым напаўненні чацвёртага пакалення вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі, прадмета «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь». У межах этапу адбывалася вяртанне агульнаадукацыйнай школы на 11-гадовы тэрмін навучання, што завяршылася ў 2014 г., і рэалізацыя пераходу ад канцэнтрычнага да лінейнага прынцыпу структуравання зместу школьнай гістарычнай адукацыі.

*Кампетэнтнасна-арыентаваны этап* (2015–2022 гг.) звязаны з падрыхтоўкай пятага пакалення школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі

Беларусі і сусветнай гісторыі, вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь» ва ўмовах рэалізацыі з 2015/2016 навучальнага года кампетэнтнаснага падыходу і завяршэння ў 2021/2022 навучальным годзе пераходу ад лінейнага да канцэнтрычнага прынцыпу структуравання зместу школьнай гістарычнай адукацыі. У гэты перыяд уведзены ў дзеянне адукацыйны стандарт агульнай сярэдняй адукацыі (2018 г.); пастановай калегіі Міністэрства адукацыі адобрана Канцэпцыя школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (2022 г.); створаны Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2022 г.), што прадвызначыла дзяржаўную палітыку ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі.

З 2023 г. пачынаецца сучасны этап развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, які характарызуецца ажыццяўленнем яе Канцэпцыі (2020 г.) ва ўмовах рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, накіраванай на замацаванне ў Беларусі беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага краіны і беларускай мадэлі гістарычнай памяці ў працэсе інтэграцыі гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі [1–А; 18–А; 22–А; 27–А; 31–А; 32–А; 42–А; 68–А; 75–А; 78–А – 83–А].

**5.** Выяўлены тэндэнцыі ў канцэптуальных мэтавызначэнні, прынцыпах абнаўлення і структуравання зместу, функцыянале школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь.

*Тэндэнцыя ў канцэптуальным мэтавызначэнні* сведчыць аб яго змяненні ад вузкапрадметнага характару і накіраванасці на авалоданне прадметнымі ведамі да арыентаванасці на развіццё і самаразвіццё вучня ў працэсе дасягнення асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў вучэбнай дзейнасці, звязаных з фарміраваннем гістарычнай памяці і нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці як інтэграваных характарыстык асобы на аснове засваення ёю сацыяльна значнага гістарычнага вопыту.

Выяўлена *тэндэнцыя, звязаная з сэнсава-зместавай пераемнасцю ў прынцыпах абнаўлення зместу* школьнай гістарычнай адукацыі: гістарызму; метадалагічнага плюралізму; навуковасці; аб’ектыўнасці; сістэматычнасці і паслядоўнасці; пераемнасці паміж канцэнтрамі; сувязі навучання з жыццём; рэалізацыі ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей; вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай. Дадзеная тэндэнцыя ўдакладняецца пры актуалізацыі наступных прынцыпаў:



– адзінства выхавання і навучання;

– дыскрэтнасці (абумоўлівае першапачатковае прапедэўтычнае фрагментарнае засваенне зместу пры далейшым павелічэнні яго аб’ёму і забеспячэнні сістэмнасці ў старэйшых класах);

– даступнасці;

– вобразнасці (улічвае магчымасці вобразнай адукацыі пры канструяванні збіральных вобразаў гістарычных падзей і іх удзельнікаў, створаных дакументальнымі і мастацкімі сродкамі з улікам перавагі візуальнага ўспрымання);

– антрапалагізацыі (абумоўлівае вывучэнне ролі чалавечага фактару ў гісторыі);

– культурна-гістарычнага асяроддзя (прадугледжвае трансляцыю персаналізаваных прыкладаў дасягненняў у галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры, ідэй (думак) і каштоўнасных арыентацый чалавека ў гісторыі з вызначэннем пераемнасці з сучаснасцю, прадстаўленне культурна-гістарычных аналагаў сацыяльных паводзін чалавека ў гісторыі);

– гістарычнай дыялагічнасці (прадвызначае камунікацыю вучняў з аддаленымі ад перыяду іх жыцця аб’ектамі вывучэння, мэтазгоднасць абагульнення і інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў, разгляд альтэрнатыўных сітуацый пры тэарэтычным асэнсаванні магчымасцей грамадскага развіцця ў гістарычным мінулым).

Практыка-арыентаваным аспектам рэалізацыі прынцыпу пераемнасці паміж канцэнтрамі з’яўляецца прапедэўтычнае навучанне на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў межах першага канцэнтру (вучэбны прадмет «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», IV клас) ва ўзаемасувязі з II ступенню агульнай сярэдняй адукацыі на другім канцэнтры, дзе адбываецца пачатак сістэмнага падзейна-храналагічнага вывучэння гісторыі Беларусі з VI класа, мінуючы V клас. Адлюстраваннем прынцыпу вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі з’яўляецца стварэнне інтэграванага курса для III ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў межах трэцяга канцэнтру.

*Тэндэнцыя цыклічнасці ў працэсе структуравання зместу* ўвасобілася ў рэалізацыі канцэнтрычнага прынцыпу (1992–2008 гг. у межах 11-гадовага навучання, з 1998 г. – у працэсе пераходу на 12-гадовы тэрмін навучання), потым – лінейнага (2009–2014 гг.) і затым – ізноў канцэнтрычнага (з 2015 г. – у межах вяртання да 11-гадовай школы, выкарыстання кампетэнтнаснага падыходу пры навучанні гісторыі). Вызначаная цыклічнасць актуалізавана

практыкай рэалізацыі канцэнтраў на I (прапедэўтычнае навучанне), II (падзейна-храналагічнае навучанне), III (праблемна-тэарэтычнае навучанне) ступенях агульнай сярэдняй адукацыі пры ўстанаўленні парытэтнага парадку вывучэння гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі. Выяўленыя шляхам анкетавання прафесійныя адносіны настаўнікаў да лінейнага і канцэнтрычнага прынцыпаў структуравання сведчаць аб прыярытэтнасці рэалізацыі канцэнтрычнага прынцыпу (перыяд апытання: лістапад 2017 г. – красавік 2022 г., 612 рэспандэнтаў, якія маюць вопыт выкладання ў V–XI класах).

Выяўлена *тэндэнцыя ў функцыянале школьнай гістарычнай адукацыі*, звязаная з комплекснай рэалізацыяй такіх традыцыйных функцый, як:

– *гісторыка-пазнавальная* (авалодванне асновамі навуковых ведаў пра найважнейшыя тэндэнцыі і заканамернасці гістарычнага развіцця грамадства ва ўсёй яго разнастайнасці і супярэчлівасці);

– *навучальная* (авалодванне агульнавучэбнымі і спецыяльнымі гістарычнымі спосабамі дзейнасці);

– *развіццёвая* (фарміраванне наглядна-вобразнага і вербальна-лагічнага тыпаў мыслення, інтэлектуальных якасцей асобы);

– *выхаваўчая* (выхаванне патрыятызму і грамадзянскасці);

– *сацыялізуючая* (інтэграцыя вучняў у сістэму сацыяльных адносін; засваенне элементаў культуры, сацыяльных норм і каштоўнасцей; фарміраванне навыкаў, неабходных для паўнацэннага жыцця ў грамадстве).

Тэндэнцыя сацыялізацыі асобы актуалізавана комплекснай рэалізацыяй такіх функцый, у тым ліку звязаных з рэалізацыяй дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, як:

– *светапоглядная* (фарміраванне гістарычнай памяці, нацыянальнай ідэнтычнасці, адказнасці за свае дзеянні перад грамадствам і дзяржавай);

– *кансерватыўна-пераемная* (захаванне гістарычнай памяці і выхаванне беражлівых адносін да месцаў памяці ў працэсе забеспячэння гістарычнай пераемнасці паміж мінулым і сучасным);

– *кансалідаваная* (папярэджанне канфрантацыйнасці ў міжасобасных і міжпакаленных адносінах на аснове талерантнага стаўлення да адрознага ад свайго жыццёвага вопыту і меркавання);

– *кампенсаторная* (дыскрэтнасць пры ўключэнні ў змест адукацыі вучэбнага матэрыялу з улікам палітызацыі гісторыі);

– *адаптацыйная* (улік узроставых і пазнавальных магчымасцей вучняў пры прадстаўленні і засваенні зместу з улікам яго эмацыянальнай афарбаванасці і асобаснай запатрабаванасці);



– *фарміраванне функцыянальнай адукаванасці* (выкананне вучнямі сацыяльных функцый, звязаных з жыццядзейнасцю ў сучасным глабальным свеце і беларускім грамадстве на аснове прыняцця сістэмы яго традыцыйных каштоўнасцей);

– *контрнаступальная* (супрацьстаянне фальсіфікацыі і рэвізіі найважнейшых падзей сусветнай і айчыннай гісторыі з улікам фарміравання крытычнага мыслення);

– *дзейнасна-паводзінская* (выкарыстанне вучнямі ў сваіх сацыяльных практыках канкрэтна-гістарычных аналагаў паводзін чалавека ў гісторыі, якія абраны ў якасці маральных арыенціраў);

– *прафарыентацыйна-прагнастычная* (выкарыстанне патэнцыялу гісторыка-культурнай спадчыны чалавецтва і Беларусі ў працэсе прафілізацыі і прафесійнага выбару вучняў у аспекце ўзаемасувязі паміж гістарычнай мінуўшчынай і асобасна-арыентаванай будучыняй) [1–А – 3–А; 10–А – 13–А; 16–А; 17–А; 20–А; 22–А; 24–А; 26–А; 30–А – 35–А; 38–А – 40–А; 42–А; 43–А; 49–А; 50–А – 52–А; 55–А; 60–А; 68–А; 75–А].

**6.** Ахарактарызаваны міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства, вызначаныя на тэарэтычным узроўні прадстаўнікамі навукова-педагагічнага супольніцтва. Дадзеныя канцэпты пазіцыяніруюцца ў якасці канцэптуальных асноў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі Рэспублікі Беларусь як сацыягуманітарнай з'явы і актуалізуюцца ў адукацыйным асяроддзі наступным чынам.

*Канцэпт гістарычнай памяці* прадугледжвае ўжыванне гісторыка-антрапалагічнага падыходу пры асвятленні ролі асобы ў гісторыі, трансляцыю ўзораў сацыяльных паводзін чалавека ў якасці культурна-гістарычных аналагаў, актуалізуецца стварэннем у Рэспубліцы Беларусь пантэона нацыянальных герояў. Канцэптуальнае значэнне мае захаванне гістарычнай памяці аб Вялікай Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта з'яўляецца адным з кірункаў дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь з улікам рэалізацыі Закона «Аб генацыдзе беларускага народа» (2022 г.) і ўвасоблена ў стварэнні вучэбна-метадычнага комплексу «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)». Канцэпт гістарычнай памяці пры рэалізацыі яго кансалідаванай функцыі мае патэнцыял пераўтварэння з інстытуцыянальнай сацыяльна-педагагічнай катэгорыі

ў інтэгратыўную якасць асобы праз канструяванне асобасна запатрабаваных і эмацыянальна афарбаваных ведаў для ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу.

*Канцэпты нацыі і нацыянальнай ідэі* адлюстроўваюць гістарычную рэтраспектыву іх фарміравання, эвалюцыю нацыі як палітычнай супольнасці (грамадзянскай нацыі) і агульнанацыянальнай ідэі – асновы светапогляду вучняў – пры рэалізацыі светапоглядна-выхаваўчай ролі школьнай гістарычнай адукацыі. Агульнанацыянальная ідэя ў сваім патэнцыяле актуалізуецца ў якасці асновы для канструявання зместу школьнай гістарычнай адукацыі.

*Канцэпт беларускай дзяржаўнасці* ў яе гістарычных і нацыянальных формах, распрацаваны беларускай акадэмічнай гістарычнай навукай, адлюстраваны ў прадметным змесце гісторыі Беларусі, актуалізуецца фарміраваннем каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь у вучняў як прадстаўнікоў сучаснай беларускай грамадзянскай нацыі і грамадзян Рэспублікі Беларусь.

*Канцэпт традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства* з'яўляецца асновай для фарміравання ў вучняў каштоўнасных арыентацый ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі, актуалізуецца іх пераемнасцю ў трансляцыі сацыяльнага вопыту, пазіцыяніруецца ў якасці адной з праксеалагічных падстаў для канструявання сацыяльна-аксіялагічнага зместу школьнай гістарычнай адукацыі і яго адбору [1–А; 4–А; 7–А; 10–А; 12–А; 15–А; 17–А; 19–А; 23–А – 25–А; 29–А; 31–А; 34–А; 39–А; 40–А; 41–А; 46–А – 48–А; 54–А – 57–А; 59–А – 64–А; 66–А; 69–А – 71–А; 74–А; 78–А; 80–А – 83–А].

**7.** Канкрэтызаваны перспектывы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, якія ўвасабляюцца ў наступных тэндэнцыях.

